**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Савецкая, 9,
220010, г. Мінск
тэл. 327-47-36, факс 200-84-83
E-mail: info@edu.gov.by

**МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Советская, 9
220010, г. Минск
тел. 327-47-36, факс 200-84-83
E-mail: info@edu.gov.by

06.12.2024 № 02-01-2553-Кол-(0)-0/1401240000976;
На № ____________ от ____________ 02-01-2602-Кол-(0)-0/1401240000992

[redacted]

[redacted]

У Міністэрстве адукацыі разгледжаны калектыўныя электронныя звароты па пытаннях павелічэння класаў з беларускай мовай навучання (ад 25.11.2024) і колькасці гадзін на вывучэнне беларускай літаратуры (ад 02.12.2024). Паведамляем наступнае.

Аб адкрыцці класаў з беларускай мовай навучання Вам быў дадзены адказ ў лісце Міністэрства адукацыі ад 24.09.2024 № 02-01-1904-Кол-(0)-0/16022400000237, у якім пазначана, што мова навучання і выхавання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі (далей – УАСА) вызначаецца яго заснавальнікам. Заснавальнікамі УАСА з'яўляюцца мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, якія і фарміруюць класы ва УАСА на падставе сацыяльнага заказу, пажаданняў бацькоў і прымаюць канчатковае рашэнне аб адкрыцці класаў з беларускай або рускай мовай навучання.

Дадаткова паведамляем, што Міністэрствам адукацыі, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, адміністрацыяй устаноў адукацыі вядзецца сістэмная тлумачальная работа сярод навучэнцаў і іх бацькоў аб арганізацыі адукацыйнага працэсу на беларускай мове.

Беларуская мова шырока выкарыстоўваецца ва УАСА, з'яўляецца не толькі вуэбным прадметам, але і рэальным сродкам навучання.

Адносна павелічэння колькасці гадзін на вывучэнне беларускай літаратуры паведамляем, што незалежна ад мовы навучання ў II-XI класах УАСА на вывучэнне беларускай і рускай літаратуры тыпавым вучэбным планам адведзена аднолькавая колькасць гадзін. Ва ўсіх УАСА беларуская літаратура вывучаецца як вучэбны прадмет. З VIII па XI класы вучні маюць магчымасць вывучаць беларускую літаратуру на двух узроўнях (базавым і павышаным).

Вывучэнне беларускай мовы і літаратуры таксама дадаткова ажыццяўляецца праз правядзенне ва УАСА факультатыўных заняткаў, конкурсаў, алімпіяд і пазакласных мерапрыемстваў, прысвечаных

юбілейным датам, знакавым падзеям, рэспубліканскім і міжнародным святам.

Установы адукацыі прымаюць актыўны ўдзел у правядзенні пошукавай і краязнаўчай работы. У шэрагу з іх створаны музеі (пакоі, экспазіцыі), у якіх шырока выкарыстоўваецца мясцовы краязнаўчы матэрыял, яго гісторыка-культурныя традыцыі, што садзейнічае папулярызацыі беларускай мовы і літаратуры і адыгрывае важную ролю ў фарміраванні светапогляду і грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў.

Такім чынам Міністэрствам адукацыі праводзіцца сістэмная работа, накіраваная на папулярызацыю беларускай мовы і літаратуры ва УАСА краіны.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З «Об обращениях граждан и юридических лиц» адказ Міністэрства адукацыі можа быць абскарджаны ў суд у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Начальнік Галоўнага ўпраўлення
агульнай сярэдняй і дашкольнай
адукацыі М.С.Кіндзірэнка

02-01 Булаўкіна 222 65 31